*Мамекін Міхаіл Сяргеевіч*

# ФАРМІРАВАННЕ ПАРТЫЙНАЙ СІСТЭМЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЯК ФАКТАР ДЯСЯГНЕННЯ МЭТАЎ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

старшы выкладчык кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ, аспірант кафедры паліталогіі, MamekinMS@bsu.by

***Анатацыя.*** Публікацыя прысвечана аналізу сучаснага стану і асаблівасцям функцыянавання палітычных партый у Рэспубліцы Беларусь. Разгледжаны асноўныя драйверы, што могуць паўплываць на дынаміку развіцця партыйнай сістэмы Рэспублікі Беларусь і якія могуць быць улічнаныя пры пабудове стратэгій па трасфармаванні партыйнай сістэмы краіны.

***Ключавыя словы:*** палітычная партыя, партыйная сістэма, грамадзянская супольнасць, картэльныя партыі, кіберпартыі, медыя-партыі, трансфармацыя партыйнай сістэмы, перспектывы развіцця партый і партыйнай сістэмы Рэспублікі Беларусь.

Садзейнічанне пабудове міралюбнага і адкрытага грамадства ў інтарэсах устойлівага развіцця, забеспячэнне доступу да правасуддзя для ўсіх і стварэнне эфектыўных, падсправаздачных і заснаваных на шырокім удзеле ўстановаў на ўсіх узроўнях, з'яўляецца адной з асноўных мэтаў устойлівага развіцця, абавязак па дасягенні якіх быў узяты на сябе ста дзевяноста трыма дзяржавамі-членамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Паводле адной з задач, якая накіравана на дасягненне вышэйзгаданай мэты, забеспячэнне адказнага прыняцця рашэнняў рэпрэзентатыўнымі органамі на ўсіх узроўнях з удзелам усіх слаёў грамадства таксама выступае прыярытэтным напрамкам дзейнасці Рэспублікі Беларусь [1].

Эфектыўны ўдзел усіх слаёў грамадства ў прыняцці важнейшых дзяржаўных рашэнняў магчымы толькі пры наяўнасці пэўнага набору фактараў, ключавым з якіх выступае існаванне развітай грамадзянскай супольнасці, у надзвычай складанай палітычнай структуры якой асаблівую ролю выконваюць палітычныя партыі. Гэта роля заключаецца ў тым, што падчас свайго функцыянавання і дзейнасці палітычныя партыі, уступаючы ў шматлікія ўзаемадзеянні як між сабой, так і з іншымі грамадскімі аб'яднаннямі і дзяржаўным апаратам, утвараючы такім чынам партыйную сістэму, выступаюць у якасці найважнейшага каналу перадачы разнастайных інтарэсаў грамадзянскай супольнасці да дзяржаўнага апарату, запяспечваючы рэпрезентатыўнасць гэтых інтарэсаў у прадстаўнічых і выканаўчых органах улады. Асаблівая роля грамадзянскай супольнасці ў палітычнай сістэме Рэспублікі Беларусь вызначана не толькі дзеючай рэдакцыяй Асноўнага Закона краіны, аднак і іншымі важнымі нарматыўнымі дакументамі. Так, яшчэ ў адпаведнасці з Нацыянальнай стратэгіяй устолйлівага развіцця на перыяд да 2030 года, у якасці адной з першачарговых мэтаў у сацыяльна-палітычнай

сферы было вызначана «фарміраванне сталай грамадзянскай супольнасці як інструмента дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўстойлівага развіцця» [2]. Згодна ўжо з Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2035 года, адной з першачарговых задач у сацыяльна-палітычнай сферы выступае «развіццё інстытутаў грамадзянскай супольнасці, пры гэтым асноўныя намаганні будуць накіраваны на забеспячэнне празрыстага і эфектыўнага ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў з грамадскімі арганізацыямі, палітычнымі партыямі, падтрымку ініцыятыў і самаразвіцця грамадзянскіх супольнасцяў» [3]. Паводле ж Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, дасягненне збалансаванасці палітычных інтарэсаў грамадзян, грамадскіх аб’яднанняў і дзяржавы, а таксама развіццё грамадзянскай супольнасці з улікам нацыянальных традыцый і асаблівасцей аднесены заканадаўцам да ліку асноўных нацыянальных інтарэсаў у палітычнай сферы. Разам з тым, недастатковы ўзровень развіцця грамадзянскай супольнасці з’яўляецца крыніцай унутраных пагроз нацыянальнай бяспецы ў палітычнай сферы. Асновай жа фарміравання і развіцця беларускай грамадзянскай супольнасці выступаюць забеспячэнне канструктыўнай накіраванасці дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў і падвышэнне стваральнай актыўнасці насельніцтва, што бачыцца немагчымым без развіцця партыйнай сістэмы.

Спрабуючы аднесці беларускую шматпартыйнасць да нейкага навукова-абгрунатаванага тыпу, распрацаванага ў межах тэорыі партый і партыйных сістэм, па некаторых прыкметах партыйная сістэма Беларусі можа быць вызначана як атамізаваная ў апаведнасці з тыпалогіяй Дж. Сарторы [4]. Аднак некаторыя навукоўцы, робячы высновы адносна беларускіх партый, нават не лічаць магчымым выкарыстоўваць паняцце “партыйная сістэма”. Так, напрыклад, І. В. Катляроў ацэньвае беларускую шматпартыйнасць як “сістэму несапраўдных (фальшывых) знакаў, цалкам адарваных ад сацыяльнай рэальнасці”. Гэтыя знакі вызначаюцца аўтарам як сімулякры палітычнай прасторы [5]. Па Сарторы, у атамізаванай сістэме партыі часткова (у нашым выпадку, фактычна цаклам), ізаляваны і ад уладных адносін, і ад сацыяльна-эканамічных працэсаў, залежнасць партый адна ад адной слаба выяўлена. Такая партыйная сістэма знаходзіцца ў нефункцыянальным стане. Нефункцыянальнасць партыйнай сістэмы Беларусі праяўляецца ў адсутнасці іх прадстаўніцтва ва ўладных структурах і яны, такім чынам, не выконваюць сваіх асноўных функцый па прасоўванні і абароне інтарэсаў свайго электарату і не могуць з’яўляцца эфектыўнай формай удзелу грамадзянаў у палітычных рашэннях. Партыі таксама не маюць сваёй сацыяльнай базы. Паколькі палітычныя партыі не валодаюць уладнымі рычагамі для вырашэння надзённых праблем людзей, большасць насельніцтва Беларусі не бачыць у існаванні гэтых палітычных інстытутаў вялікай карысці і не мае патрэбы ў іх.

Разам з тым, феномен беларускай антыпартыйнасці спалучаны з шэрагам наступных фактараў, якія саслабляюць ролю палітычных партый у нашай краіне: недастатковыя веды асаблівасцей ідэалагічнай накіраванасці сучасных

палітычных плыняў, што мае вынікам таксама і негатыўнае стаўленне грамадства да палітычных партый і рухаў; няўстойлівасць палітычных установак насельніцтва, павышаны ўплыў на іх фарміраванне ірацыянальных фактараў; існаванне інтэнсіўнага ўздзеяння на суб'ектаў палітыкі бытавых, эканамічных, этнічных, міжканфесійных фактараў. Яшчэ адной з праблем амаль усіх беларускіх партый з'яўляецца слабая матэрыяльна-тэхнічная база. Крайняя ступень фрагментацыі партыйных сіл, іх няздольнасць да кансалідацыі нават у тым выпадку, калі справа тычыцца згуртавання партый з падобнай ідэалагічнай арыентацыяй, што дзейнічаюць ў адным палітычнам полі. Пры гэтым пераважная колькасць партый не мае выразна выяўленай пазіцыі па асноўных пытаннях сучаснасці і развіцця нашай краіны, партыі не праводзяць тэарэтычную працу па распрацоўцы і змене палітычных праграм, якія, у большасці сваёй, так і засталіся з перыяду іх стварэння. Партыі не маюць сістэматызуючага фактару, які адрозніваў бы адну партыю ад іншай. Пры гэтым існуе так званы "крызіс лідараў", бо партыі не маюць запамінальных партыйных дзеячаў, якія ў цяжкія палітычныя моманты здольныя прымаць важныя палітычныя рашэнні і г.д.

У якасці асноўных драйвераў, што могуць паўплываць на дынаміку развіцця партыйнай сістэмы Беларусі і адзначаюцца як навукоўцамі, так і палітычнымі дзеячамі краіны, прыводзяцца наступныя: а) далейшае развіццё беларускай палітычнай сістэмы, якое павінна асэнсоўвацца як кіруючай элітай, так і грамадствам, адбывацца паступова пры папярэдняй лібералізацыі палітычнага жыцця; б) пераход да змяшанай ці прапарцыянальнай выбарчай сістэмы; в) увядзенне дзяржаўнага субсідзіравання дзейнасці палітычных партый, а таксама ўкараненне іншых механізмаў дзяржаўнай падтрымкі (даванне на бязвыплатнай аснове памяшканняў, вылучэнне грантаў і субсідый); г) пашырэнне электаральных прывілеяў для палітычных партый (напрыклад, манапольнае права на вылучэнне кандыдатаў на выбарныя дзяржаўныя пасады ці манапольнае права на вылучэнне кандыдатаў пры абранні часткі дэпутатаў парламента або часткі дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу); д) магчымая інстытуцыялізацыя РГА «Белая Русь» як палітычнай партыі ўлады (уплыў гэтага драйверу можа стаць даволі істотным для транфсармацыі партыйнай сістэмы Беларусі, аднак залежыць як ад зменаў у палітычным працэсе, так і ў спецыялізаваным заканадаўстве); е) перарэгістрацыя палітычных партый у адпаведнасці з абноўленым заканадаўствам; ё) уплыў сусветных тэндэнцый развіцця палітычных партый.

Першыя чатыры драйверы, на нашу думку, могуць стаць найбольш вызначальнымі як асобна, так і ў сукупнасці для трансфармацыі партыйнай сістэмы Беларусі. Варта адзначыць, што як змяненню выбарчага заканадаўства, так і ўвядзенню дзяржаўнага субсідзіравання ці электаральных прывілеяў павінна спадарожнічаць прававое ўрэгуляванне асноваў унутрыпартыйнай дэмакратыі (напрыклад, прававое рэгуляванне такіх нормаў, як рэгламент абрання на кіруючыя пасады; абмежаванне тэрміну знаходжання на іх; падсправаздачнасць партыйнага кіраўніцтва; перыядычнасць правядзення

з'ездаў; парадак правядзення кансультацый з членамі партыі; даступнасць фінансавай і іншай інфармацыі, якая тычыцца дзейнасці партыі – усё гэта спрыяе фарміраванню палітычнай культуры яе членаў, а таксама развіццю добрасумленнай палітычнай канкурэнцыі, якая таксама з'яўляецца адной з умоваў павышэння даверу да дэмакратычнай палітычнай сістэмы). У сітуацыях, калі закон не замацоўвае дэмакратычнага ўнутранага ўладкавання палітычных партый, прапарцыянальная ці змяшаная выбарчая сістэма можа быць выгаднай вузкай партыйнай верхавіне, што прывядзе да адчужэння ад палітыкі партыйнага электарату.

Выдзяленне дзяржаўных субсідый палітычным партыям, з аднаго боку, можа актывізаваць і стымуляваць іх канкурэнцыю, а з іншага – ёсць вялікая верагоднасць, што гэта можа стаць цяжарам для падаткаплацельшчыкаў. Для стымулявання дзейнасці палітычных партый Беларусі некаторымі даследчыкамі ў якасці магчымай меры вылучаецца мадэль 1/4, пры якой партыі, якія прынялі ўдзел у выбарчай кампаніі (пры прад'яўленні расходных каштарысаў), атрымлівалі б кампенсацыю расходных сродкаў у перыяд электаральнай кампаніі [6, с. 123]. Для стымулявання кантактаў з выбаршчыкамі і актыўнасці на нізавым узроўні магчыма ўвядзенне не прамой дзяржпадтрымкі партый, а селектыўнага падатку, які б дазволіў грамадзянам самастойна накіроўваць частку падаткаў, якія выплачваюцца імі, на падтрымку канкрэтнай арганізацыі. Але гэты механізм з'яўляецца вельмі складаным для рэалізацыі і прадугледжвае рэфармаванне падатковай сістэмы.

Магчымае ўвядзенне дзяржаўнага субсідзіравання дзейнасці палітычных партый, а таксама ўкараненне іншых механізмаў дзяржаўнай падтрымкі можа мець вынікам узнікненне залежнасці палітычных партый ад дзяржавы. Пры гэтым партыі грунтоўна ўбудоўваюцца ў сістэму дзяржаўнай улады і дзяржаўных інтарэсаў, усё больш адрываюцца ад грамадства, што можа прывесці да з'яўлення "картэльных партый". Пры гэтым увядзенню дзяржаўнага фінансавання могуць спадарожнічаць такія негатыўныя з'явы, як карупцыя. Гэта акалічнасць будзе патрабаваць увядзення сапраўдных і дзеючых механізмаў кантролю над фінансавай дзейнасцю партый у выглядзе справаздачнасці, укаранення прынцыпу празрыстасці бюджэту партый і адпаведнай падрыхтоўкі нарматыўных падставаў для кантролю за выкарыстоўваннем партыямі грашовых сродкаў.

Што тычыцца перарэгістрацыі палітычных партый, то яна, безумоўна, павінна быць праведзена, бо на цяперашні момант многія з палітычных партый існуюць толькі на паперы. Падобная мера таксама магла б стаць станоўчым імпульсам для кансалідацыі некаторых партый з блізкімі ідэалагічнымі праграмамі і агульнымі каранямі. Аднак лік заснавальнікаў не павінен быць зменены ў бок падвышэння.

Сучасныя тэндэнцыі развіцця палітычных партый у свеце таксама могуць паўплываць на трансфармацыю партыйнай сістэмы Беларусі. Да такіх тэндэнцый, у першую чаргу варта аднесці віртуалізацыю палітычнага поля і, як вынік, партыйнага змагання і больш адкрыты стыль камунікацыі палітыкаў з

грамадствам дзякуючы развіццю ІКТ, што прывяло да ўзнікнення ў свеце медыя-партый і кіберпартый.

Такім чынам, дзеючая шматпартыйная сістэма ў беларускім грамадстве магчыма ў тым выпадку, калі ў ім складуцца перадумовы (інстытуцыянальныя, палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, прававыя, ідэалагічныя, арганізацыйна-прававыя, культурныя і інш.), працягнецца паступовая дэмакратызацыя палітычнай сістэмы, узнікнуць устойлівыя групы інтарэсаў насельніцтва, якія запатрабуюць свайго прадстаўніцтва ў выбарных дзяржаўных органах, з'явяцца новыя лідары, гатовыя генераваць ідэі і выказваць настроі мас, аб'яднаных вакол агульнанацыянальных мэтаў і каштоўнасцяў. Станоўчая трансфармацыя партыйнай сістэмы будзе пазітыўна ўплываць не толькі на пабудову грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь, але і на дасягненне мэтаў устойлівага развіцця.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Цели устойчивого развития [Электронный ресурс] // Цель 16: Мир, правосудие и эффективные институты. – Режим доступа: https://sdgs.by/targets/target16/ – Дата доступа: 29.10.2022.
2. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2030 г. [Электронный ресурс] // Сайт Министерства Экономики Республики Беларусь. – Режим доступа: https://economy.gov.by/uploads/files/NSUR2030/Natsionalnaja-strategija-ustojchivogo-sotsialno-ekonomicheskogo-razvitija-Respubliki-Belarus-na-period-do-2030-goda.pdf – Дата доступа: 01.11.2022.
3. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2035 г. [Электронный ресурс] // Сайт Министерства Экономики Республики Беларусь. – Режим доступа: https://economy.gov.by/uploads/files/NSUR/NSUR-2035.pdf. – Дата доступа: 01.11.2022.
4. Сартори, Дж. Партии и партийные системы: рамки анализа / Дж. Сартори // Партии и выборы: Хрестоматия. – 2004. – №1. – С. 14–25.
5. Котляров, И. В. Симулякры политического пространства. Белорусские партии: социологические тренды / И. В. Котляров // Беларуская думка. – 2014 – №1. – С. 64–71.
6. Гаўрыкаў, А. В. Перспектывы развіцця палітычных партый у Рэспубліцы Беларусь (палітыка-сацыялагічныя аспекты) / А. В. Гаўрыкаў // Труд. Профсоюзы. Общество: ежеквартальный научно-практический журнал / Федерация профсоюзов Беларуси, Международный университет "МИТСО". – 2021. – № 1. – С. 120 – 126.